**УДК 81’282:811.161.3**

# ТЫПЫ ФРАЗЕАЛАГІЧНЫХ ДЫЯЛЕКТЫЗМАЎ З АНАМАСТЫЧНЫМ КАМПАНЕНТАМ У БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯЛЕКТНАЙ МОВЕ

***Н.А. ЛЕЎЧАНКА***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Я. Купалы)***
***Natalia-alex21@yandex.ru***

*На матэрыяле беларускіх гаворак разглядаюцца дыялектныя фразеалагізмы з кампанентам – уласным імем. Вылучаюцца асноўныя тыпы беларускіх фразеалагічных дыялектызмаў, паказваецца іх адрозненне ад літаратурных эквівалентаў. Адзначаецца, што развіццё фразеалагічных дыялектызмаў абумоўлена лінгвістычнымі і экстралінгвістычнымі фактарамі.*

***Ключавыя словы:*** *фразеалагізм, анамастычны кампанент, дыялектны варыянт, фразеалагічны дыялектызм, літаратурны фразеалагічны адпаведнік.*

**Уводзіны.** Адной з прымет фразеалагізма з’яўляецца ўстойлівасць, якая прадугледжвае «пастаянства замацаванага за ім зместу, кампанентнага складу і структуры» [1, с. 5]. Тым не менш у дыялектнай мове зафіксаваны мадыфікацыі аднаго і таго ж фразеалагізма на фанетычным, лексічным, марфалагічным і сінтаксічным узроўнях, якія праяўляюцца ў вар’іраванні формы, кампанентнага складу і зместу.

У сучасным мовазнаўстве не існуе агульнага пункту гледжання адносна таго, ці варта прызнаваць варыянтамі рэгіянальныя відазмяненні агульнанародных фразеалагізмаў. Так, паводле сцвярджэння Г.В. Баброўскай, «дыялектныя фразеалагічныя варыянты можна кваліфікаваць як розныя рэалізацыі агульнанародных фразеасемантычных мадэляў» [2, с. 13].

На думку Л.І. Райзензона, памылковым з’яўляецца разгляд дыялектных фразеалагізмаў у якасці варыянтаў агульнанародных выразаў: «…пра варыянтнасць гаварыць тут няма падстаў, таму што ў народных гаворках нярэдка ствараюцца свае асобныя фразеалагічныя адзінкі, якія ў адносінах да адпаведных агульнанародных фразеалагічных адзінак з’яўляюцца паралельнымі, незалежнымі ўтварэннямі» [3, с. 46].

Існуе яшчэ адно тлумачэнне дыялектна-літаратурных варыянтных адносін фразеалагізмаў. Так, М.А. Даніловіч адзначае, што дыялектныя выразы, якія маюць літаратурныя эквіваленты, «у маштабе ўсёй нацыянальнай мовы як сістэмы можна (з пэўнай доляй умоўнасці) назваць варыянтнымі» [4, с. 16].

Многія даследчыкі адзначаюць, што варыянтнасць дыялектнай фразеалогіі ў параўнанні з варыянтнасцю фразеалогіі літаратурнай мовы больш адметная і разнастайная [5, с. 3; 4; 6].

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца класіфікацыя і характарыстыка дыялектных фразеалагізмаў з анамастычным кампанентам з пункту гледжання іх адносін да фразеалогіі беларускай літаратурнай мовы.

Аб’ектам даследавання з’явіліся 170 беларускіх фразеалагізмаў з анамастычным кампанентам, а таксама з кампанентам *Бог* і кампанентам-ад’ектонімам, выяўленыя метадам суцэльнай выбаркі з фразеалагічных і лексічных слоўнікаў беларускай дыялектнай мовы, фальклорных і лінгвістычных зборнікаў, картатэкі «Фразеалагічны слоўнік Гродзеншчыны».

**Асноўная частка**. Варта спыніцца на вызначэнні тэрміна «дыялектны фразеалагізм». М.А. Даніловіч слушна адзначае, што памылковым з’яўляецца разуменне пад дыялектнымі фразеалагізмамі толькі тых выразаў, у складзе якіх ёсць дыялектнае слова ці дыялектнае значэнне слова [7, с. 56]. Пад тэрмінам «дыялектны фразеалагізм» неабходна разумець устойлівы зварот, які пашыраны на пэўнай дыялектнай тэрыторыі і адсутнічае ў такой форме ці значэнні ў літаратурнай мове [4, с. 16].

Пры параўнанні дыялектных фразеалагізмаў з фразеалогіяй літаратурнай мовы яны набываюць статус фразеалагічных дыялектызмаў. Вылучэнне фразеалагічнага дыялектызма ажыццяўляецца на падставе яго супастаўлення з устойлівым зваротам, які прыняты «ў адпаведнасці з нормай за ўзор» [8, с. 35] і выступае «інварыянтам пры тых ці іншых змяненнях» [9, с. 82].

Такім узорным інварыянтам мэтазгодна лічыць літаратурны фразеалагізм. «У слоўніках літаратурнай мовы цытаты пісьменнікаў выконваюць вызначальную ролю, таму што менавіта майстры літаратуры ў першую чаргу вызначаюць нормы літаратурнага словаўжывання», – піша Б.А. Ларын [10, с. 149].

Супастаўленне фразеалагічнага матэрыялу беларускіх гаворак з літаратурнымі выразамі «ажыццяўляецца не толькі для канстатацыі факта адрознення паміж імі, але, галоўным чынам, для таго, каб глыбей пранікнуцца ў дыялектны матэрыял з мэтай апісаць і прааналізаваць адзначаныя адрозненні» [11, с. 7].

Першая спроба класіфікацыі фразеалагічных дыялектызмаў была здзейснена І.Я. Лепешавым. Даследчык вылучыў асобныя разнавіднасці такіх дыялектызмаў [12, с. 226–227].

М.А. Даніловіч прапанаваў удакладненую класіфікацыйную схему, якая, на думку даследчыка, «здольна ахапіць усе разнавіднасці фразеалагічных дыялектызмаў, якія бытуюць у гаворках» [4, с. 19]. Згодна з ёю ў гэтым артыкуле вылучаюцца наступныя тыпы фразеалагічных дыялектызмаў: фразеалагічна-фанетычныя, фразеалагічна-словаўтваральныя, фразеалагічна-марфалагічныя, фразеалагічна-лексічныя, фразеалагічна-семантычныя, канструкцыйна-колькасныя і камбінаваныя фразеалагічныя дыялектызмы. Не разглядаюцца ў артыкуле ўласнафразеалагічныя дыялектызмы: яны не ўступаюць з літаратурнымі фразеалагізмамі ў варыянтныя адносіны, з'яўляюцца самастойнымі ўтварэннямі і заслугоўваюць асобнага вывучэння.

*Фразеалагічна-фанетычныя дыялектызмы* (17 адзінак, што складае 10% ад агульнай колькасці прааналізаваных фразеалагічных дыялектызмаў з уласным імем) – выразы, якія бытуюць на пэўнай тэрыторыі і пры захаванні дэнататыўна-канататыўнай тоеснасці адрозніваюцца ад літаратурных адпаведнікаў фанетычна: асобнымі гукамі, месцам націску ў кампанентах ці тым і другім адначасова [13, с. 67]. Так, фразеалагізм *іван-да-мар'я* са значэннем 'братаўка; невялікая расліна з жоўтымі кветачкамі з сінім верхам' (РСТС[1]) разыходзіцца з суадносным літаратурным зваротам *іван-ды-мар'я* асобным гукам. Падамо яшчэ некалькі прыкладаў гукавога несупадзення ў кампанентах: *імець бога ў серцы* 'быць спагадлівым' (НМ[2]) – *мець бога ў сэрцы* (тут і далей у супастаўляльнай пары першым падаецца дыялектны варыянт, а другім – літаратурны эквівалент, зафіксаваны ў наступных слоўніках беларускай літаратурнай фразеалогіі: СФ-1[3], СФ-2[4], ФСМК[5], СФМК[6], ЭСФ[7]); *німа чаго бога гнявіць* 'няма прычын жаліцца на лёс' (ФСК[8]) – *няма чаго бога гнявіць;* (хай будэ) *як Сёра казала* 'так, як каму-н. хочацца' (БД-3[9]) – (няхай будзе) *як Сора казала; збіцца з панталыгу* 'заблытацца' (СкНМ-1993[10]), *збіцца з панталыгі* (МСГВ[11], ППФВ[12]) – *збіцца з панталыку*.

Узнікненне фразеалагічна-фанетычных дыялектызмаў можна растлумачыць рознымі прычынамі.

Па-першае, «гукавыя заканамернасці дыялекту вызначаюць спецыфіку формы кожнага канкрэтнага фразеалагізма пры параўнанні яго з адпаведнымі формамі ў іншых дыялектных сістэмах і літаратурнай мове» [13, с. 67]. У гаворках Гродзеншчыны зафіксаваны выраз *хай буг крэя* <чаго> 'выказванне перасцярогі ад чаго-н. непажаданага' (варыянт літаратурнага *хай Бог крые)*: *Усё пражылося, хай Бух крэя. Ні давалі жыць. Норму далі вельку. Прышлі гэтыя вызваліцелі, як налажылі падат…* Шурычы Свісл. *Хай Бух крэя, як жылі. Пасьля вайны была беднота, адналічно жылі, лён абівалі, пралі.* Вострава Зэльв. (ДМГ[13]). Вышэйзгаданы фразеалагічна-фанетычны дыялектызм ілюструе такія фанетычныя асаблівасці беларускіх гаворак, як вымаўленне [у] на месцы [о] і недысіміляцыйнае яканне.

Праілюструем яшчэ некаторыя фанетычныя асаблівасці гаворак, якія знайшлі адбітак у дыялектных фразеалагізмах з анамастычным кампанентам: няпоўнае недысіміляцыйнае аканне, тыповае для гродзенска-баранавіцкай і часткова сярэднебеларускіх груп гаворак (*пайсці да Абрама на піво* (Fed.[14]) –

---

[1] РСТС – Раслінны свет : тэматычны слоўнік / склад. В.Д. Астрэйка [і інш.] ; навук. рэд. Л.П. Кунцэвіч, А.А. Крывіцкі. – Мінск : Беларус. навука, 2001.– 655 с.

[2] НМ – Юрчанка, Г.Ф. Народнае мудраслоўе : слоўнік / Г.Ф. Юрчанка. – Мінск : Бел. навука, 2002. – 319 с.

[3] СФ-1 – Лепешаў, І.Я. Слоўнік фразеалагізмаў : у 2 т. / І.Я. Лепешаў. – 2-ое выд., дапоўн. і выпр. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2008. – Т. 1 : А–Л. – 672 с.

[4] СФ-2 – Лепешаў, І.Я. Слоўнік фразеалагізмаў : у 2 т. / І.Я. Лепешаў. – 2-ое выд., дапоўн. і выпр. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2008. – Т. 2 : М–Я. –704 с.

[5] ФСМК – Фразеалагічны слоўнік мовы твораў Якуба Коласа : звыш 6000 слоўн. арт. / уклад. А.С. Аксамітаў [і інш.] ; пад рэд. А.С. Аксамітава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 655 с.

[6] СФМК – Ляшчынская, В.А. Слоўнік фразеалагізмаў мовы твораў Янкі Купалы / В.А. Ляшчынская, З.У. Шведава ; М-ва адукац. РБ, Гомельскі дзярж. ун-т ім. Францыска Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2007. – 312 с.

[7] ЭСФ – Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2004. – 448 с.

[8] ФСК – Зайка, А. Фразеалагічны слоўнік Косаўшчыны / А. Зайка. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2014. – 308 с.

[9] БД-3 – Беларуская дыялекталогія: матэрыялы і даследаванні : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук, Цэнтр даследаванняў бел. культуры, мовы і літаратуры, Філіял "Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы" ; рэдкал.: В.М. Курцова, Л.П. Кунцэвіч. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – Вып. 3. – 304 с.

[10] СкНМ-1993 – Цыхун, А.П. Скарбы народнай мовы (з лексічнай спадчыны насельнікаў Гродзенскага раёна) / А.П. Цыхун. – Гродна : ГрДУ, 1993. – 243 с.

[11] МСГВ – Сцяшковіч, Т.Ф. Матэрыялы да слоўніка Гродзенскай вобласці / рэд. Ю.Ф. Мацкевіч, М.А. Жыдовіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 620 с.

[12] ППФВ – Сцяшковіч, Т.Ф. Прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы, выслоўі народных гаворак Гродзенскай вобласці / Т.Ф. Сцяшковіч ; Гродзенскі дзярж. пед. ін-т імя Янкі Купалы. – Гродна, 1968. – 75 с.

[13] ДМГ – Дыялектная мова Гродзеншчыны : хрэстаматыя / аўт.-склад. : М.А. Даніловіч, Н.К. Памецька. – Гродна : ГрДУ, 2007. – 260 с.

[14] Fed. – Federowski, M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej / Michał Federowski. – Warszawa, 1935. – T. 4. – 490 s.

*пайсці да Абрама на піва*; *шкляного бога бачыць* (КФСГ[15]) – *шклянога бога бачыць, на божой пасцелі* (ФСК) – *на божай пасцелі*); зацвярдзенне некаторых зычных у брэсцка-пінскай групе гаворак (*ек Марко пу пэклу* (ДСБ[16]) – *як Марка па пекле*).

Па-другое, фанетычныя дыялектна-літаратурныя несупадзенні могуць быць выкліканы наяўнасцю ў структуры фразеалагізма слоў іншамоўнага паходжання. Так, у дыялектным фразеалагізме (зарабіць) *як Заблоцкі на мыдля* ‘зусім нічога, нiколькі ці амаль нічога, нiколькі не зарабіць’ змяненне назоўнікавага кампанента *мыдля* выклікана ўплывам польскай мовы (спалучэнне *dł* на месцы *л*): *Гэты гот вазілі прадаваць парасяты аж у Табарышкі, але зарабілі як Заблоцкі на мыдля.* Лысая Гара Ашм.[17] (КФСГ). Такая рыса фанетычнай сістэмы польскай мовы, як спалучэнне галосных з насавымі зычнымі на месцы насавога *ą*, адзначаецца ў выразе *як у хваробе свянтэго Левантэго* ‘вельмі моцна (дрыжаць, трэсціся); ад страху, хвалявання ці холаду’ (СДФГ[18]) – *як у хваробе святога Лявэнтага*. Такім чынам, фанетычныя асаблівасці ў фразеалагізмах могуць мець пазафразеалагічны характар, г.зн. «яны развіліся ў фанетычнай ці лексічнай сістэмах і адтуль трапілі ў фразеалагізмы, надаючы апошнім дыялектную афарбоўку» [13, с. 67].

*Фразеалагічна-словаўтваральныя дыялектызмы* (10 фразеалагізмаў, або 6%) адрозніваюцца ад літаратурных адпаведнікаў марфемна-словаўтваральнай структурай кампанентаў. Так, суфіксальныя разыходжанні кампанентаў фразеалагізмаў зафіксаваны ў наступных прыкладах: *на боскай пасцелі* ‘на смяротным ложку’ (СПЗБ[19], Fed.) – *на божай пасцелі*; *як ксёндз Магдулі* ‘вельмі добра (дагадзіць каму-н.)’ (В[20]) – (дагадзіць) *як ксёндз Магдусі*.

Выяўлены і прэфіксальныя разыходжанні кампанентаў дыялектных і літаратурных фразелагізмаў: *падзеля Бога* (СПЗБ) – *дзеля Бога*, (зарабіць) *як Блоцкі на мыле* (Зай.[21]) – *як Заблоцкі на мыле*.

Найбольшай словаўтваральнай варыянтнасцю ў фразеалагічных дыялектызмах з анамастычным кампанентам характарызуюцца назоўнікі. Як адзначае І.М. Хлусевіч, «назоўнікавы кампанент у складзе многіх фразеалагізмаў можа нарматыўна выкарыстоўвацца з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі» [14, с. 57]. Напрыклад, выраз *ні Богу свечка ні чорту качарэжка* са значэннем ‘пасрэдны чалавек, які нічым не вызначаецца’ (СДФГ) у літаратурнай мове мае раўназначны адпаведнік *ні Богу свечка ні чорту качарга.* Тут дыялектны фразеалагізм адрозніваецца ад літаратурнага дэмінутыўным суфіксам -*к*-.

Прыметнікі займаюць другое месца пасля назоўнікаў у фармаванні фразеалагічна-слова-ўтваральных дыялектызмаў з анамастычным кампанентам. Зафіксаваны суфіксальныя разыходжанні ў наступных літаратурна-дыялектных паралелях: *Божа міленькі* (Fed.) – *Божа мілы, божава кароўка* (СПЗБ) – *божая кароўка*.

*Фразеалагічна-марфалагічныя дыялектызмы дыялектызмы* (14 фразеалагізмаў, або 8%) супадаюць з літаратурнымі адпаведнікамі семантычна, але характарызуюцца іншымі, чым у літаратурнай мове, марфалагічнымі (склонавымі, лікавымі, асабовымі) формамі кампанентаў [5, с. 6]. Як зазначае Л.А. Івашка, «здольнасць фразеалагізма вар’іравацца вызначаецца граматычнай сістэмай гаворкі» [6, с. 68].

Разгледзім спачатку прыклады, у якіх марфалагічнае адрозненне зыходзіць ад назоўнікавага кампанента.

Так, родавыя несупадзенні могуць быць абумоўлены дзеяннем аналогіі [15, с. 68]. Прыкладам можа служыць фразеалагізм *садома і гамора* (СкНМ-2014[22]) – *садом і гамора*, у якім першы кампанент набыў канчатак -*а* пад уплывам форм жаночага роду.

Па мадэлі эмацыянальна-экспрэсіўных форм, характэрных для дыялектнага маўлення (тыпу *дзеткі, дзетачкі, мамачкі* і г.д.), адзначана іншая, чым у літаратурным выразе, лікавая форма назоўнікавага кампанента ў фразеалагічна-марфалагічным дыялектызме *Божачкі мае* ‘выказванне розных пачуццяў’ –

---

[15] КФСГ – Картатэка “Фразеалагічны слоўнік гаворак Гродзеншчыны”, складзеная М. А. Даніловічам.

[16] ДСБ – Дыялектны слоўнік Брэстчыны / склад. М.М. Аляхновіч [і інш.] ; рэд. Г.М. Малажай, Ф.Д. Клімчук. – Мінск : Навука і тэхніка,1989. – 294 с.

[17] Ашм. – Ашмянскі; Зэльв. – Зэльвенскі; Іўеў. – Іўеўскі; Маст. – Мастоўскі; Мсцісл. – Мсціслаўскі; Шчуч. – Шчучынскі.

[18] СДФГ – Даніловіч, М.А. Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны / М.А. Даніловіч. – Гродна : Гродз. дзярж. ун-т, 2000. – 267 с.

[19] СПЗБ – Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча : у 5 т. / уклад. Ю.Ф. Мацкевіч, А.І. Грынавецкене, Я.М. Рамановіч [і інш.] ; рэд. Ю.Ф. Мацкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка. – 1979–1986. – Т. 1–5. – 512 с., 728 с., 536 с., 616 с., 563 с.

[20] В – Выслоўі / Акадэмія навук Беларускай ССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора ; рэдкал.: В.К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 520 с.

[21] Зай. – Зайка, А. Прыказкі і прымаўкі, жарты і каламбуры, прыгаворкі і языкаломкі, вясельныя прыгаворы пры дзяльбе каравая, вітанні і зычэнні, ветлівыя і ласкавыя выразы, засцярогі і прысяганні, праклёны і адкляцці, жартоўныя праклёны і дражнілкі-кепікі, зневажанні і параўнанні, прыкметы народнага календара з Косаўшчыны / Алесь Зайка. – Мінск : Тэхналогія, 2015. – 286 с.

[22] СкНМ-2014 – Цыхун, А.П. Скарбы народнай мовы (з лексічнай спадчыны насельнікаў Гродзенскага раёну) / А.П. Цыхун. – Гародня : Гарадзенская бібліятэка, 2014. – 243 с.

варыянт літаратурнага *божачка мой: Аднаму пагадала – і ўсё праўда, другому – праўда. А Божачкі ж мае, так кожну картачку і переznала.* Лаздуны Іўеў. (ДМГ, НС[23]).

Несупадзенні склонавых канчаткаў, што адлюстроўваюць варыянтнасць у марфалагічнай сістэме гаворак, назіраюцца ў наступных фразеалагізмах: (ганяць) *як Марка па пекле* (СДФГ), *як Марка па пеклу* (СМН[24], Ляц.[25], ВКС[26], Юрч.-З[27], В) – *як Марку па пекле;* (блукацца) *як Марка па пеклу* (ВКС) – (хадзіць, блукаць, снаўдацца і пад.) *як Марка па пекле*; *як Заблоцкі на мылі* (Fed.) – (зарабіць, выручыць, выгадаць і пад.) *як Заблоцкі на мыле.*

Варыянтнасць прыметнікавага кампанента зафіксавана ў фразеалагізме *Божа короўка* (ТС-1[28]) – *божая кароўка*, у якім выкарыстоўваецца сцягнутая форма прыметніка ў назоўным склоне. Гэтая марфалагічная асаблівасць з’яўляецца прыкметнай дыялектнай рысай беларускага паўднёва-заходняга дыялекту [4, с. 41].

Дыялектна-літаратурныя адрозненні дзеяслоўнага кампанента знаходзім у структуры дыялектнага фразеалагізма *да Масквы ракам не перараставіць* са значэннем ‘вельмі многа’ (СДФГ), дзе ўжываецца інфінітыўная форма. У літаратурным адпаведніку *да Масквы ракам не пераставіш* выкарыстана форма 2 асобы будучага простага часу.

Адметнай марфалагічнай асаблівасцю паўночна-заходняй дыялектнай зоны з’яўляецца ўжыванне дзеепрыслоўяў закончанага трывання ў выказніках [16, с. 221]: *у Бога цяля ўкраўшы* (КФСГ) – *у Бога цяля ўкраў.*

Адносна нешматлікую групу складаюць *фразеалагічна-сінтаксічныя дыялектызмы* (7 фразеалагізмаў, або 4%), якія, у параўнанні з фразеалагізмамі літаратурнай мовы, характарызуюцца змяненнем сінтаксічных сувязяў і адносін, парадку слоў-кампанентаў пры захаванні тоеснаснасці плана зместу. Так, у выразе *паехаў да Рыгі* са значэннем ‘званітавала каго-н., звычайна пры моцным ап’яненні’ (Fed.) – *ездзіў у Рыгу* сінтаксічныя адрозненні дыялектнага і літаратурнага фразеалагізмаў праяўляюцца ў несупадзенні прыназоўнікава-склонавых формаў кампанентаў. Несупадзенне тыпаў сказаў у дыялектна-літаратурных эквівалентах назіраецца ў фразеалагізме *Маскву відаць (відно)* ‘вельмі кіслае што-н.’ – *Масква відаць*: *Гэтыя яблыкі нісьпелыя яшчэ, укусіш – Маскву відаць, а яны [дзеці] ні глядзяць, ужэ паўяблыні абабралі.* Бабіна Гродз. *Ну як парэчкі, ці ўкусныя? Мусяць, Маскву відаць?* Аздобічы Шчуч. (СДФГ).

Сінтаксічныя адрозненні дыялектнага і літаратурнага выразаў з анамастычным кампанентам могуць праяўляцца ў змяненні парадку слоў-кампанентаў (*Маскву паказаць* каму ‘падняць каго-н. (звычайна дзіця) угору, узяўшы за галаву далонямі да вушэй’ (СДФГ) – *паказваць (паказаць) Маскву*).

Падамо яшчэ некалькі прыкладаў фразеалагічна-сінтаксічных дыялектызмаў: *да Бога душою* (не вінаваты) (КФСГ) – *Богу душой* (не вінаваты), *ні к Богу ні к людзям* (Нос.[29]) – *ні Богу ні людзям, Богом па-крыўджаны* (ФСК) – *бог пакрыўдзіў* каго-н.

Дастаткова прадстаўнічай выяўляецца группа *фразеалагічна-лексічных дыялектызмаў* (46 фразеалагізмаў, што складае 27% ад агульнай колькасці фразеалагічных дыялектызмаў), якія адрозніваюцца ад літаратурных эквівалентаў цэлым словам-кампанентам. Абавязковай прыметай фразеалагічна-лексічнага дыялектызма з’яўляецца супадзенне яго семантыкі з семантыкай літаратурнай адзінкі параўнання.

Найчасцей вар’іруюцца назоўнікавыя і дзеяслоўныя кампаненты. Так, у складзе дыялектызма *як у Нёман кануў* ‘прапаў, знік, не паяўляецца куды-н.’ (варыянт літаратурнага *як у ваду кануў*) адбылася замена агульнага назоўніка ўласным: *Як пашла замуш, ні разочку дахаты ні было, як у Нёман канула.* Гудзевічы Маст. (СДФГ). Рускамоўны сінанімічны кампанент назіраецца ў варыянце *анюціны глазкі* ‘браткі; травяністая расліна з фіялетавымі, радзей белымі або рознакаляровымі кветкамі’ (СкНМ-2014, РСТС) – *анюціны вочкі.*

Вар’іравацца могуць больш як два назоўнікі, утвараючы шматкампанентны варыянтны рад: *ні Богу свечка ні чорту ожах (галавешка, кацуба, малітва, чапяла)* (СДФГ), *ні Богу свечка ні чорту дуда* (Нос.) – *ні Богу свечка ні чорту качарга.*

---

[23] НС – Народныя скарбы : дыялектал. зб. (да 80-годдзя А. А. Крывіцкага) / Ін-т мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі ; рэд. Л.П. Кунцэвіч. – Мінск : Права і эканоміка, 2008. – 388 с.

[24] СМН – Ліцвінка, В.Д. Слова міма не ляціць: Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі / В.Д. Ліцвінка, Л.А. Царанкоў ; навук. рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Універсітэцкае, 1985. – 149 с.

[25] Ляц. – Ляцкий, Е.А. Материалы для изучения творчества и быта белорусов. / Е.А. Ляцкий. – М., 1898. – Вып. 1. Пословицы, поговорки, загадки. – 63 с.

[26] ВКС – Каспяровіч, М.І. Віцебскі краёвы слоўнік : матар’ялы / М.І. Каспяровіч. – Віцебск, 1927. – 368 с.

[27] Юрч.-З – Юрчанка, Г.Ф. Слова за слова: Устойлівыя словазлучэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны / уклад. Г.Ф. Юрчанка ; пад рэд. А.А. Крывіцкага. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 272 с.

[28] ТС-1 – Тураўскі слоўнік : у 5 т. / А.А. Крывіцкі [і інш.] ; пад рэд. А. А. Крывіцкі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – Т. 1 : А–Г. – 255 с.

[29] Нос. – Сборник белорусских пословиц, составленный И.И. Носовичем. – СПб, 1874. – 232 с.

Прыкметную групу складаюць «тыпалагічна падобныя» [7, с. 28] фразеалагічна-лексічныя дыялектызмы, якія разыходзяцца з суадноснымі літаратурнымі выразамі анамастычным кампанентам: *Хомка няверны* (Янк.-1979[30]), *няверны Томаш* (СДФГ), *Тамаш (Томаш) няверны* (ЗНФ[31]) ‘чалавек, якога цяжка прымусіць паверыць чаму-н.’ – *Фама няверны (няверуючы)*; (выскачыць, вырвацца) *як Раман з канапель* (В), *як Ясько з канапель* (ППФВ) ‘вельмі нечакана’ – *як Піліп з канапель*; (зарабіць, выйграць, вышаў) *як Гарэцкі на мыле* ‘нічога (не зарабіць)’ (В) – (зарабіць) *як Заблоцкі на мыле*. З дапамогай замены лексічнага кампанента рэалізуецца ўзмацненне і абнаўленне ўнутранай формы дыялектнага фразеалагізма.

Прыклады разыходжанняў дзеяслоўных кампанентаў у дыялектных і літаратурных фразелагізмах: *чытаць Храпавіцкага* ‘моцна спаць, звычайна храпучы, пахрапваючы’ (СДФГ) – *задаваць (задаць) Храпавіцкага, звесці з панталыку* (СГВ[32]) – *збіць з панталыку*.

Адзначым, што варыянтныя кампаненты могуць быць блізкімі па значэнні словамі і ўваходзіць у адну лексіка-семантычную групу, напрыклад: *адвесіць перуноў* каму ‘накрычаць, насварыцца на каго-н’ (СДФГ) – *даваць (даць) перуноў, мець Бога ў жываце* ‘быць лаяльным, спагадлівым, чулым да каго-н.’ (СДФГ) – *мець бога ў сэрцы*.

Зрэдку ў структуры дыялектных выразаў адбываецца вар'іраванне адразу двух ці трох кампанентаў. Падамо прыклады без канкрэтызацыі значэнняў фразеалагізмаў: *дзе Макар цялят не пасе* (Fed.) – куды Макар цялят не ганяў; *Кузьма Грышку родны Фёдар* (СДФГ) – *Андрэй Кузьме родны (Хвёдар) Хведар*; *хай Бог адхіляе (адварочвае), хай Бог бароніць* (СДФГ) – *няхай (хай) бог крые (ратуе)*.

Неабходна зазначыць, што ўзнікненне фразеалагічна-лексічных дыялектызмаў можа павялічвацца за кошт выкарыстання рэгіянальных і іншамоўных слоў [4, с. 57]: *сцяклянный бог* ‘бутэлька з алкагольным пітвом’ (НМ) – *шкляны бог*; *стрэж божа* ‘выказванне папярэджання, засцярогі ад чаго-н. нежаданага, недапушчальнаг’ (ЗНФ) – *барані божа*.

Адносна прадстаўнічай выглядае група *канструкцыйна-колькасных фразеалагічных дыялектызмаў* (25 фразеалагізмаў, або 15%), сутнасць якіх у тым, што яны «бытуюць на пэўнай тэрыторыі і адрозніваюцца ад літаратурных пры тоеснасці значэнняў колькасцю кампанентаў» [4, с. 64].

Узнікненне канструкцыйна-колькасных фразеалагічных дыялектызмаў можа быць вынікам эліпсіса (скарачэння кампанентнага складу) або нарашчэння (павелічэння колькасці кампанентаў).

Скарачэнне фразеалагізма назіраем у наступным прыкладзе: *як за плячыма* ‘спакойна, ціха, без асаблівых клопатаў і трывог, з дастаткам (жыць)’ (СБНФ[33]) – *як у Бога за плячыма*. Паводле меркавання В.М. Макіенкі, скарачэнне кампанентнага складу фразеалагізмаў з’яўляецца «адной з праяў прынцыпу моўнай эканоміі, які ўласцівы ўсім узроўням мовы» [17, с. 79]. Акрамя гэтага, фразеалагічны эліпсіс «ілюструе багатыя выразныя магчымасці фразеалагізмаў» [18, с. 99], выконвае экспрэсіўную функцыю. Адсутнасць падобнага скарачэння ў фразеалагізмах літаратурнай мовы сведчыць «пра некаторае адставанне літаратурнай фразеалогіі ад дыялектнай у канкрэтных праявах свайго развіцця» [7, с. 57].

Шляхам нарашчэння ўтварыліся наступныя канструкцыйна-колькасныя дыялектызмы: *на Юр’я як рак свісня* ‘ніколі ці невядома калі’ (Fed.) – *як рак свісне; ні да танца ні да ружанца ні свенты Божа спеваць* ‘ні на што не здатны, няўмелы’ (СДФГ) – *ні да танца ні да ружанца*; *пабойся Бога і людзей* ‘май сумленне, злітуйся’ (ФСК) – *пабойся Бога; як Пятроў бот з левай нагі* ‘вельмі (дурны)’ (СДФГ) – *як бот з левай нагі*. Яны «на фоне звыклых агульнанародных адпаведнікаў выглядаюць свежа і арыгінальна» [7, с. 57].

У беларускіх гаворках зафіксаваны выразы *як рак на Лысай гары засвішча* і *як рак на Дамянішкаўскай гары свісне* са значэннем ‘ніколі ці невядома калі’ (СДФГ) – *калі (як) рак <на гары> свісне*. Як бачым, пад рэгулярную факультатыўнасць можа падпадаць анамастычны кампанент, які надае індывідуальную вобразнасць дыялектнаму фразеалагізму, ажыўляе яго ўнутраную форму.

*Фразеалагічна-семантычныя дыялектызмы* (11 адзінак, або 6%) выяўляюцца на падставе дыялектна-літаратурнага супастаўлення выразаў па «сэнсавых сферах» [8, с. 63] і характарызуюцца вар’іраваннем плана зместу пры тоеснасці структуры фразеалагізма.

Наяўнасць фразеалагічна-семантычных дыялектызмаў можа быць абумоўлена працэсам полісемантызацыі. Падамо некалькі прыкладаў дыялектна-літаратурных паралеляў: *дзякуй Богу* ‘выказванне радасці, задавальнення, палёгкі, супакою з якой-н. прычыны’ (ДСК[34]) і 1) ‘вельмі добра’, 2) ‘вельмі добры’, 3) ‘вельмі многа чаго-н.’, 4) ‘выказванне радасці, задавальнення, палёгкі, супакою з якой-н. прычыны’; *Божа збаў* ‘выказванне папярэджання, засцярогі ад чаго-н. нежаданага, недапушчальнага’ (ФСК)

[30] Янк.-1979 – Янкоўскі, Ф. Яшчэ з народнай фразеалогіі / Ф. Янкоўскі, Т. Тамашэвіч, М. Аляхновіч // Слова, фразеалагізм і кантэкст : зб. арт. / М-ва асветы БССР, Мінскі дзярж. пед. ін-т ім. М. А. Горкага ; пад рэд. Ф. Янкоўскага. – Мінск, 1979. – С. 42–57.

[31] ЗНФ – Лепешаў, І.Я. З народнай фразеалогіі : дыферэнцыяльны слоўнік / І.Я. Лепешаў. – Мінск : Выш. шк., 1991. – 110 с.

[32] СГВ – Сцяшковіч, Т.Ф. Слоўнік Гродзенскай вобласці / Т.Ф. Сцяшковіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 671 с.

[33] СБНФ – Мяцельская, Е.С. Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі / Е.С. Мяцельская, Я.М. Камароўскі. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1972. – 320 с.

[34] ДСК – Зайка, А. Дыялектны слоўнік Косаўшчыны / А. Зайка. – Слонім : Слонімская друкарня, 2011. – 272 с.

і 1) ‘выказванне папярэджання, засцярогі ад чаго-н. нежаданага, недапушчальнага’, 2) ‘выка-званне рашучага адмаўлення чаго-н. або нязгоды з чым-н.’.

Слушным, на наш погляд, з’яўляецца сцвярджэнне М.А. Даніловіча, што «звычайна той самы фразеалагізм у літаратурнай мове мае большую колькасць значэнняў, чым у канкрэтнай гаворцы… калі ж браць дыялектную мову ў цэлым, то полісемія ў ёй багацейшая за кошт сумарнай колькасці фразеалагічна-семантычных дыялектызмаў, спецыфічных у шматлікіх раёнах Беларусі» [4, с. 87–88].

Цікавым пряўленнем семантычных дыялектна-літаратурных адрозненняў выступае энантыясемія – з'яўленне ў адной моўнай адзінкі супрацьлеглага, антанімічнага значэння, якое можа выцясняць першапачатковае або суіснаваць з ім [19, с. 208]. Гэта выклікана «зместавай супрацьлегласцю адпаведных іх вобразаў» [20, с. 53]. Так, дыялектны фразеалагізм *як ксёндз Магдалене (Магдзе, Магдусі)* раэлізуе значэнне ‘зусім не (дагадзіць каму-н.)’ (СДФГ). У літаратурнай мове фразеалагізм вядомы з супраць-леглым значэннем: (дагадзіць) *як ксёндз Магдусі* ‘вельмі добра (дагадзіць каму-н.)’. Дэнататыўная энантыясемія рэалізавана і ў наступным прыкладзе: *Богу душою* ‘вельмі, ва ўсім (вінен)’ (Fed.) – *Богу душою* ‘зусім, абсалютна ні ў чым (не вінен)’.

Пашыранай у беларускіх гаворках з’яўляецца група *камбінаваных фразеалагічных дыялектызмаў* (40 адзінак, або 24%), якія сумяшчаюць асаблівасці розных тыпаў раней разгледжаных дыялектызмаў. Так, выраз *пры царэ Гарошку, як было людзей трошкі* (В) адрозніваецца ад літаратурнага адпаведніка *пры цару Гароху* склонавымі канчаткамі і суфіксамі кампанентаў-назоўнікаў, большай колькасцю кампанентаў, камбінуючы рысы фразеалагічна-словаўтваральнага, фразеалагічна-марфалагічнага і канструкцыйна-колькаснага дыялектызмаў.

Аналіз фактычнага матэрыялу паказаў, што ў большасці выпадкаў камбінаваныя фразеалагічныя дыялектызмы з анамастычным кампанентам канцэнтруюць у сабе два віды дыялектызмаў. Разгледзім некалькі камбінацый фразеалагічных дыялектызмаў:

1) фразеалагічна-фанетычны, фразеалагічна-марфалагічны і фразеалагічна-сінтаксічны: *Божаго свету ні відно* (ДСК) – *свету божага не відаць;*

2) фразеалагічна-фанетычны і фразеалагічна-лексічны: *бы в Хрыста за пазухыю* (БД-3) – *як у Хрыста за пазухаю*; *збірацца да Абраама на госці* (СПЗБ-2) – *адпраўляцца (ісці, ехаць) да Абрама (да Абрагама) на піва;*

3) фразеалагічна-фанетычны і фразеалагічна-семантычны: *дзенькуя Богу* ‘вельмі добра’ (НС) – *дзякуй богу* 1) ‘вельмі добра’, 2) ‘вельмі добры’, 3) ‘вельмі многа чаго-н’, 4) ‘выказванне радасці, задавальнення, палёгкі, супакою з якой-небудзь прычыны’; *бронь (бруні, брынь) Божа* ‘выказванне перасцярогі ад чаго-н. непажаданага’ (НС) – *барані божа* 1) ‘выказванне папярэджання, засцярогі ад чаго-н. нежаданага, недапушчальнага’, 2) ‘выказванне рашучага адмаўлення чаго-н. або нязгоды з чым-н.’;

4) фразеалагічна-марфалагічны, фразеалагічна-сінтаксічны і фразеалагічна-лексічны: *Бог пецярым нёс, аднаму дастаўся* нос у каго ‘вельмі вялікі’ (ДСК) – *Бог семярым нёс ды аднаму дастаўся*; (зарабіць) *бы Броцкі на мылі* ‘пратаргавацца’ (СкНМ-2005[35]) – (зарабіць) *як Заблоцкі на мыле*;

5) фразеалагічна-марфалагічны і фразеалагічна-лексічны: *за каралём гарохавым* ‘вельмі даўно, невядома калі’ (СДФГ) – *за царом гарохам*; *дай Божа ножачкі* (ДМГ) – *дай бог ногі*;

6) фразеалагічна-сінтаксічны і фразеалагічна-лексічны: *як Марак у пекле* (СДФГ) – *як Марка па пекле, сустракацца (сустрэцца) з шкляным богам – бачыць (убачыць) шклянога бога* (ЗНФ).

Прыкметы трох тыпаў дыялектызмаў, напрыклад, фразеалагічна-фанетычнага, фразеалагічна-лексічнага, фразеалагічна-семантычнага зафіксаваны ў наступным выразе: *ні давядзі Госпадзі* ‘выказванне ацэнкі, характарыстыкі чаго-н. звычайна з боку сілы, ступені’ (ДСК) – *не давядзі Бог* 1) ‘выказванне папярэджання, засцярогі ад чаго-н. нежаданага, недапушчальнага’, 2) ‘выказванне адзнакі, характарыстыкі чаго-н. звычайна з боку сілы, ступені і пад.’.

**Заключэнне**. Узнікненню і функцыянаванню розных тыпаў фразеалагічных дыялектызмаў садзейнічаюць такія фактары, як вусная форма існавання дыялектаў, адаптацыя да фанетычных і граматычных асаблівасцяў гаворак, тэндэнцыя да эканоміі моўных сродкаў, імкненне ўзмацніць эмацыянальна-экспрэсіўныя тэндэнцыі, абнаўленне ўнутранай формы фразеалагізма, іншамоўны ўплыў і інш. Як слушна адзначае Т.М. Федуленкава, «варыянтнасць у галіне фразеалогіі – гэта вынік праявы агульных моўных заканамернасцей, актуальных для ўсіх узроўняў мовы» [21, с. 63].

ЛІТАРАТУРА

1. Лепешаў, І.Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы : вучэб. дап. для студэнтаў філал. фак-таў ВНУ / І.Я. Лепешаў. – Мінск : Вышэйш. шк., 1998. – 271 с.

[35] СкНМ-2005 – Скарбы народнай мовы : дыялектал. зб. / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа ; рэд. Л.П. Кунцэвіч. – Мінск : Права і эканоміка, 2005. – 385 с.

2. Бобровская, Г.В. Системно-функциональное взаимодействие литературной и донской диалектной фраземики : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.01 / Г.В. Бобровская ; Волгоградский гос. пед. ун-т. – Волгоград, 2002. – 26 с.
3. Ройзензон, Л.И. Проблемы изучения диалектной фразеологии / Л.И. Ройзензон // Труды Самаркандского гос. ун-та им. А. Навои. Новая серия. – Самарканд : Изд-во Самарк. ун-та, 1972. – Вып. 237 : Вопросы фразеологии. VI. Восточно-славянская диалектная фразеология и фразеография. – С. 1–57.
4. Даніловіч, М.А. Беларуская дыялектная фразеалогія і яе лексічная аснова : манагр. / М.А. Даніловіч. – Гродна : ГрДУ, 2003. – 272 с.
5. Касцючык, В.М. Сінанімія і варыянтнасць у дыялектнай фразеалогіі (на матэрыяле гаворак Брэстчыны) : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / В.М. Касцючык ; Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. – Брэст, 2002. – 21 с.
6. Ивашко, Л.А. Очерки русской диалектной фразеологии / Л.А. Ивашко. – Л. : Изд-во Ленингр. ун-та, 1981. – 198 с.
7. Даніловіч, М.А. Слова і фразеалагізм у беларускай мове : зб. навук. арт. / М.А. Даніловіч. – Гродна : ЮрСаПрынт, 2015. – 300 с.
8. Телия, В.Н. Вариантность идиом и принципы идентификации вариантов / В.Н. Телия // Проблемы устойчивости и вариантности фразеологических единиц : материалы междунар. симпозиума, Тула, ноябрь 1968 ; отв. ред. В.Л. Архангельский ; Тульский пед. ин-т. – Тула, 1968. – С. 30–69.
9. Зимин, В.И. К вопросу о вариантности фразеологических единиц / В.И. Зимин // Проблемы устойчивости и вариантности фразеологических единиц : материалы междунар. симпозиума, Тула, ноябрь 1968 ; отв. ред. В.Л. Архангельский; Тульский пед. ин-т. – Тула, 1968. – С. 70–82.
10. Ларин, Б.А. История русского языка и общее языкознание : пособие для студ. пед. ин-тов / Б.А. Ларин. – М. : Просвещение, 1977. – 224 с.
11. Оссовецкий, И.А. Лексика современных русских народных говоров / И.А. Оссовецкий. – Л. : Наука, 1982. – 198 с.
12. Лепешаў, І.Я. Праблемы фразеалагічнай стылістыкі і фразеалагічнай нормы / І.Я. Лепешаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 264 с.
13. Даніловіч, М.А. Дыялектныя фанетычныя асаблівасці фразеалагізмаў / М.А. Даніловіч // Беларуская лінгвістыка. – 2001. – Вып. 51. – С. 67–72.
14. Хлусевіч, І.М. Варыянтнасць фразеалагізмаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове / пад рэд. праф. І.Я. Лепешава. – Гродна : ГрДУ, 2002. – 100 с.
15. Блінава, Э. Беларуская дыялекталогія : вуч. дапам. / Э. Блінава, Е. Мяцельская. – 2-е выд., дапрацаван. і дапоўн. – Мінск : Выш. школа, 1980. – 304 с.
16. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы : дапам. / А.А. Крывіцкі. – Мінск : Выш. школа, 2003. – 294 с.
17. Мокиенко, В.М. Славянская фразеология / В.М. Мокиенко. – М. : Высш. шк., 1980. – 207 с.
18. Третьякова, И.Ю. Эллипсис как приём окказионального преобразования фразеологических единиц / И.Ю. Третьякова // Вестник КГУ им. Н. А. Некрасова. – 2011. – № 1. – С. 97–100.
19. Шмелёв, Д.Н. Современный русский язык. Лексика / Д.Н. Шмелёв. – М. : Просвещение, 1977. – 336 с.
20. Даніловіч, М.А. Фразеалагічна-семантычныя дыялектызмы / М.А. Даніловіч // Беларуская лінгвістыка. – 2002. – Вып. 52. – С. 53–62.
21. Федуленкова, Т.Н. Фразеологическая вариантность как лингвистическая проблема / Т.Н. Федуленкова // Вестник ОГУ. Сер. Гуманитарные науки. – 2005. – № 4. – С. 62–69.

*Паступіў 03.01.2018*

## TYPES OF PHRASEOLOGICAL DIALECTISMS WITH ONOMASTIC COMPONENT IN THE BELARUSIAN DIALECTAL LANGUAGE

***N. LEUCHANKA***

*The article considers Belarusian dialectal phraseological units with the proper name component. The aim of the study is classification and characterization of dialectal phraseological units with onomastic component in terms of their relationship with the phraseology of the Belarusian literary language. The main types of Belarusian phraseological dialectisms are outlined, their difference from the literary equivalents is shown. It is noted that the development of phraseological dialectisms is due to linguistic and extralinguistic factors.*

***Keywords**: phraseological unit, onomastic component, phraseological dialectism, literary phraseological analogue.*